# ДАКРАНУЦЦА ДА «ЗВЯЗДЫ»


Фота Надзеі БУЖАН.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спачатку — падарожжа ў часе. Калі вярнуцца ўсяго на 40 гадоў назад, то на месцы ажыўленага праспекта мы знойдзем толькі засеянае поле. Складана паверыць, што вялізныя абшары на паўднёвым захадзе Мінска (цяпер гэта раёны Міхалова, Брылевічы, Паўднёвы Захад, Малінаўка) зусім нядаўна адносіліся да сельскай мясцовасці і былі аграрным прыдаткам сталіцы. А вось калі мы на ўяўнай машыне часу рушым яшчэ далей праз стагоддзі, то зноў апынёмся ў цэнтры бурнага жыцця: у X—XI стагоддзях тут было паселішча. Аб гэтым сведчаць былыя паганскія могілкі, зімой удала прыстасаваныя пад ледзяную горку, — чатырохметровы курган дыяметрам 20 метраў. Пры забудове раёна вучоныя праводзілі тут даследаванні і нават ўсталявалі ахоўную зону, але абараніць гістарычную каштоўнасць ад набегу мясцовай дзятвы не ўдалося.

Вяртаючыся з далёкага мінулага, агледзімся вакол: у пасляабедзенны час у будны дзень асаблівага ажыўлення на праспекце не назіраецца. Павольна шпацыруюць маладыя мамы з каляскамі, грэюцца на сонейку бабулі, то тут, то там сустракаюцца вясёлыя кампаніі падлеткаў — інакш кажучы, ідылія ў адным асобна ўзятым кутку сталіцы. Зрэшты, ці так гэта, лепш спытаць у месцічаў.

## «Калі б мне зараз прапанавалі выбраць любы іншы раён, ні за што б не пераехала!»

Ганну мы ловім амаль на ляту, яна спяшаецца на практыку: «Я перайшла на апошні курс гістарычнага факультэта БДУ, таму для мяне назва праспекта — гэта зусім не пусты гук. Думаю, ідэя з перайменаваннем была добрай: мы жывём у Беларусі і павінны акцэнтаваць увагу на гісторыі менавіта нашай краіны. Але, мне здаецца, што істотна гэта не паўплывала на ўзровень ведаў сярод жыхароў праспекта. Магчыма, не хапае інфармацыйных таблічак, якія б тлумачылі, у гонар каго ці чаго была названа тая ці іншая вуліца. Альбо можна пераняць вопыт экскурсійнага аўтобуса нумар 1: некалькі разоў на дзень пускаць транспарт, у якім будуць гучаць кароткія звесткі аб гісторыі горада, выдатных асобах».

Прагульваючыся па ціхіх, цяністых дварах, знаёмімся з кампаніяй маладых мам. «Мы тут жывём з самага дзяцінства, яшчэ бацькі кватэры атрымалі. Але нават калі б мне зараз прапанавалі выбраць любы іншы раён, ні за што б не пераехала! Тут так спакойна, — усміхаецца жанчына. — Пры гэтым побач ёсць усё, што неабходна: магазіны, школа, дзіцячы садок, паліклініка не так далёка, шмат транспарту. Я і працую тут паблізу. Ды на нашым праспекце столькі людзей хочуць здымаць жыллё! Мяне задавальняе абсалютна ўсё, акрамя некалькіх маленькіх пытанняў. Нягледзячы на тое, што раён немалады, бліжэйшы садок перапоўнены. І яшчэ адзін момант, таксама звязаны з дзецьмі: пляцоўку хоць і абнавілі, а з жыхарамі не параіліся. Нас яны не вельмі задавальняюць. Напрыклад, мне з гадавалым дзіцем там рабіць няма чаго, а павінны ж быць улічаны інтарэсы кожнага... Вось я трохі і паскардзілася вам, але наш праспект ўсё роўна лічу найлепшым».



Акупаваўшы адразу дзве лаўкі, падлеткі шумна размаўляюць і прыцягваюць да сябе ўвагу ўсёй дзіцячай пляцоўкі. «Раён як раён, яму не хапае самабытнасці, таго, што з пазітыўнага боку вылучала б яго сярод іншых. Напрыклад, цікавае графіці. Мы не маем на ўвазе неахайныя, то тут, то там раскіданыя малюнкі ці надпісы. Не, гэта павінен быць добра прадуманы праект, які адлюстраваў бы атмасферу гэтага месца», — сур'ёзна разважаюць хлопцы.

«Што тут ёсць асаблівага, дык гэта выгляд праспекта з 21 паверха. Жыхары, вядома, не вельмі ўхваляюць тое, што там, на высоцы, збіраецца моладзь, ды і ўсякія выпадкі бывалі... Але гэта месца сапраўды прыцягвае, ёсць у ім свая магія і рамантыка», — раскрывае сакрэт самы дзелавіты з хлопцаў.

Рухаемся далей. Здалёку назіраем за шчаслівай сям'ёй, якая захоплена гуляе ў мяч. Ветлівыя Вольга з Мікалаем і маленькай дачушкай Алісай кватэру на праспекце газеты «Звязда» здымаюць: «Мы выбралі гэты раён, таму што, з аднаго боку, яго можна аднесці да спальнага, тут ціха і спакойна, а з іншага боку, праспект знаходзіцца зусім побач з цэнтрам. У нас ужо нават ёсць сваё любімае месца — пляцоўка перад Маскоўскім рынкам. Часта мы з Аліскай частуем там галубоў, — смяецца Вольга. — Мінулай зімой мы з мужам выпрабавалі знакамітую горку, якая збірае дзяцей з усяго раёна, а сёлета плануем пазнаёміць з ёй і дачку. Хачу вам сказаць, што гэта прыемны бонус!»

Дарэчы, зняць аднапакаёвую кватэру на праспекце можна пачынаючы ад 400 рублёў. Трапляюцца і вельмі прывабныя варыянты — 800 рублёў за чатырохпакаёвую кватэру. Жыллё на праспекце сапраўды карыстаецца папулярнасцю: аб'явы аб арэндзе доўга не вісяць.

**Цікава:**
**На праспекце газеты «Звязда» пражывае 18 чалавек, дзень нараджэння ў якіх выпадае на 9 жніўня і супадае з датай заснавання газеты. Мы сардэчна віншуем іх са святам, жадаем шчасця, здароўя і доўгіх гадоў жыцця!**

## Ліцэйскае брацтва і першая двухзоркавая гасцініца

Пасля знаёмства з жыхарамі адпраўляемся па знакавых мясцінах праспекта. У яго пачатку сярод буйных дрэў схаваўся ўнушальных памераў будынак. Тут размяшчаюцца адразу дзве адукацыйныя ўстановы: сярэдняя школа нумар 165 і ліцэй нумар 1.

**Калі вярнуцца ўсяго на 40 гадоў назад, то на месцы ажыўленага праспекта мы знойдзем толькі засеянае поле. Складана паверыць, што вялізныя абшары на паўднёвым захадзе Мінска (цяпер гэта раёны Міхалова, Брылевічы, Паўднёвы Захад, Малінаўка) зусім нядаўна адносіліся да сельскай мясцовасці і былі аграрным прыдаткам сталіцы.**

Фізіка-матэматычны, хіміка-біялагічны, эканамічны, філалагічны і хіміка-матэматычны (пакуль выклікае здзіўленне, але ўжо запатрабаваны на рынку) профілі прапануюцца на выбар высокаматываваным вучням, якія гатовы вытрымаць дадатковыя выпрабаванні, каб са школьнікаў ператварыцца ў ліцэістаў. І іх можна зразумець, бо ліцэй не выпадкова атрымаў такі нумар: узровень падрыхтоўкі ў ім адзін з самых высокіх ва ўсёй краіне. Перамогі ў гарадскіх, рэспубліканскіх і нават міжнародных алімпіядах і конкурсах, навукова-практычных канферэнцыях, 100-бальныя сертыфікаты на цэнтралізаваным тэсціраванні — гэта прыемныя, але ўжо звыклыя вынікі напружанай працы.

«Поспехі ў вучобе — гэта выдатна, гэта тое, у што ўкладаецца велізарная колькасць сіл, але акрамя прамой практычнай задачы ў дзейнасці нашай навучальнай установы ёсць яшчэ і маштабная звышідэя: стварыць сапраўднае ліцэйскае брацтва, — з запалам расказвае **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Анжаліка АНАНІЧ**. — Мы стараемся афарміць, умацаваць і перадаць пэўныя традыцыі. Я вам нават больш скажу: вучоба ў ліцэі паступова выхоўвае асаблівы тып мыслення. Растлумачу чаму. Маладыя людзі паступаюць да нас пасля 9 класа, такое рашэнне ўжо можна назваць абдуманым — гэта першы крок да самастойнасці. У хуткім часе пасля пачатку вучобы праводзіцца асаблівае свята, можна нават сказаць сакрамэнт — пасвячэнне ў ліцэісты. Вучні атрымліваюць шаўроны (традыцыйныя нашыўкі) і білеты ліцэіста. Дзякуючы гэтаму з'яўляецца асаблівае пачуццё дачынення да нечага маштабнага, сур'ёзнага. Вучні нават жартуюць, што, калі ў транспарце іх просяць паказаць даведку, а яны дастаюць білет ліцэіста, адразу пачынаюць адчуваць сябе саліднымі людзьмі. Дарэчы, пра гэта: у нас вельмі добра развіта сістэма самакіравання. У перадвыбарчы перыяд разгортваюцца сапраўдныя баталіі, пачынаючы ад рэкламных плакатаў, адкрытага мікрафона, заканчваючы днём маўчання перад самімі выбарамі».


**Апынуўшыся на праспекце, не можам абысці бокам кватэру ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Галіны Лаўрэнцьеўны БЕЛАМЫТЦАВАЙ. Нарадзіўшыся ў Сібіры, усё свядомае жыццё акрамя некалькіх страшных ваенных гадоў яна правяла ў Беларусі. Работа ў падполлі, мінская турма, нямецкі канцлагер... каб думкамі вярнуцца ў той час, ёй трэба доўга збірацца з сіламі. Развітваючыся з намі, Галіна Лаўрэнцьеўна ўсё паўтарае: «Я вам жадаю аднаго: толькі б не было вайны. Толькі б не было вайны...»**

Натхніўшыся гісторыямі аб ліцэйскім брацтве, адпраўляемся далей. Некалькі міні-супермаркетаў, дзіцячы садок, ЖЭК, цырульня, аптэка, салон сувязі, невялікія офісы — тут можна жыць з камфортам нават не пакідаючы межаў праспекта! Падчас прагулкі заўважаем, што амаль кожныя 5 хвілін па дарозе асцярожна праязджаюць машыны з характэрнай літарай «У», усталяванай на даху. Так, гэта месца можа

**«Думаю, ідэя з перайменаваннем была добрай: мы жывём у Беларусі і павінны акцэнтаваць увагу на гісторыі менавіта нашай краіны».**

прымусіць трапятаць, бо тут праходзяць зусім не простыя маршруты для здачы экзамену ў ДАІ. На вялікім, якраз складаным для развароту скрыжаванні адзін насупраць аднаго размяшчаюцца гастраном з сакавітай назвай «Лясная ягада» і самы буйны гандлёвы аб'ект на праспекце — «Маскоўскі рынак». Аматары паласавацца ведаюць, што на рынку можна адшукаць сапраўдныя ядомыя скарбы, якія выраслі на прысядзібных участках. У канцы праспекта знойдуць сабе прытулак стомленыя вандроўнікі: тут знаходзіцца гасцініца «Звезда», якая ў свой час першая ў Беларусі атрымала статус двухзоркавай. Кошт нумароў у гэтай вар'іруецца ад 42 да 107 рублёў за ноч.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*